пры ламанні *заломаў* і знішчэнні пры зачароўванні стрэльбы на цэлкія стрэлы і пры «адчароўванні» яе, калі ёсць падазрэнне на яе пашкоджанасць чарамі, пры закляццях ворагаў (маленне на каленях перад асінавым кійком, уваткнутым у зямлю, ламанне аб яго свечак), пры магічным лячэнні зубнога болю, ліхаманкі і інш. Засцерагальныя, ахоўныя ўласцівасці А. прымяняліся найперш пры ўзаемадзеянні з надпрыроднымі сіламі і персанажамі (ахова жывёлы шляхам прагону з хлява праз гарачае асінавае вуголле, ахова ад *Хлеўніка* сцябаннем пугаю на асінавым пугаўі, забіванне асінавага кала ў магілу нябожчыка, што «ходзіць» і палохае людзей, ці *Ведзьмы*, Ведзьмака, Чараўніка і інш.). А. ў магічнай класіфікацыі прадметаў дараўноўвалася да жалеза. Менавіта пярэваратні для *метамарфоз* у іншыя істоты выкарыстоўвалі альбо нажы, уторкнутыя ў зямлю вастрыём уверх, альбо асінавыя пні, непахрышчаныя пры ссяканні дрэва. Перакульваннем праз асінавы пень можна было пазбавіцца ад хваробы — ухапіўшы зубамі край асінавага пня, імкліва перакуліцца праз яго. А. сімвалізавала ахову, абгароджванне, сталае заканчэнне. Калі хтосьці расчараваны вырашаў спыніць нейкую справу, нейкі стан, то заяўляў: «Горкай асінкай я гэта заламлю» — значыць, ніколі да гэтага не вярнуся. Гэты выраз сустракаецца ў песні *Провадаў русалкі*:

Правяду русалку, правяду,
Да й асінкаю заламлю,
Каб тая русалка па жыце не хадзіла,
Майго жыта не ламіла.

*Літ.*: Легенды і паданні. Мн., 1983; Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., 1992. С. 291; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996; Тое ж. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999; Малоха М. Фразеологизмы с концептом «дерево» в зеркале народной культуры. Мн., 1998. С. 73—79.

*Л. М. Салавей.*

**АСІПОВІЦКІ НАРОДНЫ АНСАМБЛЬ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ І МУЗЫКІ «ЛЮЛЕЧКА»** Цэнтральнага дома культуры. Заснаваны ў 1989, з 1991 народны. Кіраўнікі: Л.Грынько (з 1989), В.Давідовіч (з 1999). Удзельнікі ансамбля валодаюць майстэрствам ігры на баяне, скрыпцы, дудцы, жалейцы, цымбалах і ліры. Калектыў адраджае бел. нац. традыцыі фалькл. ансамблевага музыцыравання і вясельных абрадаў. У рэпертуары больш за 50 апрацовак бел. нар. танцаў і найгрышаў: «Ішла Каляда», «Да запейно песню слаўнаму пану», «Стой на нашай, на вуліцы», «Зялёная ліпа», «Камары», «Гаголушка», «Цераз лясочак, лясочак», «Вясельныя песні», «Беларускі барынь», «Купалася Кася ў моры», «У нядзелю ў Слуцку», «Бел малойчык» і інш. Калектыў — лаўрэат Міжнароднага фестывалю нар. музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы, 1999), мае Гран-пры фестывалю традыцыйнай бел. песні і музыкі ў Горацкім раёне (1992), узнагароджаны дыпломамі Міжнароднага фестывалю ў г.п. Крыўлень, Малдова (і спецыяльны прыз, 1993), фестываляў «Славянская культура» ў Кішынёве (1996), сямейнага мастацтва ў г. Глуск, расійска-бел. дружбы ў Кранштаце (абодва 2001). Прымаў удзел у тэлефестывалі «Таленты Прыдняпроўя» (2002), тэлеперадачы «Спявай, душа» (2003).

*С. С. Авадок.*



*Асіповіцкі народны ансамбль беларускай народнай песні і музыкі «Люлечка».*

**«АСЛЕПЛЕНЫ АДНАВОКІ ВЕЛІКАН»**, адзін з асноўных персанажаў казак сюжэтнага тыпу СУС 1137. Вядомы па «Адысеі» як Паліфем. Сюжэт гэтых казак міжнародны. Шырока прадстаўлены ў фальклоры ўсходніх славян: апублікаваны 16 рускіх, 16 украінскіх, 7 бел. варыянтаў. Яшчэ 3 бел. варыянты, запісаныя ў апошні час, захоўваюцца ў архівах. У бел. казках сюжэт